БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухсуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 50. Менск. Субота 25 мая 1918 г. Год I

Менск 25/г.

Селяне на Віцебшчыне ні могуць прызвычаіцца да савецкіх парадкау—аб гэтым лямэнтуюць Віцебскія «Извѣстія».

Селяне на Меншчыне у часе панавания большэвікоу надта ніахвотна згаджаліся рабіць большэвіцкія камітэты, прынамсі самі ні хацелі у іх уступаць.

І разам с тым пры уселякіх выбарах селяне аддавалі свае галасы большэвікам, а было шмат выпадкау, калі пазьбіраць весткі аб іх з усей Беларусі, што падаваліся пагавору і с камісарамі і «прэдсядацелямі»--дэзэртырамі дзеля гоноровых прычын— на чале, ішлі разьбіваць і рабаваць двары.

Чаму яно так?

Што беларускі селянін даўно чакае зямельнай рэформы і мейсцамі ні без зайздрасьці паглядае на памешчыцкі грунт,—ні таемніца.

Што, да гэтаго, ніпаразумення, якія часамі выклікаліся саусім дробнымі прычынамі, як нідагляд за жывелай напрыклад, сеялі дарэмную ніпрыязнасьць з абодвых бакоу,—так сама ведама.

Два гэтыя момэнты у селянскай псыхіцэ мусілі, канечня, прычыніцца да учасьця нашых селян у разгромах двароу, але прыглецзіушыся да разгрому убачым, што у іх ні уся прычына.

Павінно было істнаваць іншэ нешта, каб змусіць селяніна забыцца свaей традыцыйнай цярпілівасьць і пашаны да права прыватнай уласьнасьці. Тое з'явішчо, што ні проста адбіралася зямля (яна найчасьцей і ні чапалася саусім), ні проста забіраусл, інвэнтар, (на яго, здаралася так сама ні надта квапіліся), але што рабілася поукае ніштэнне усяго прыватнаго дворскаго меняя, да апошняй шыбы у вакне, да апошняго цьвічочка, што дапушчауся брыдкі зьдзек над уласьнікамі, сьведчыць, што адной «зямельнай» справы ні загладзіш, а трэба нешто іншае.

Гэто,—нацыянальнае зразуменне і нацыянальнае з'еднанне.

Эканамічны падзел на станы гісторыя паглубіла у нас нацыянальным падзелам.

Наша веска была зауседы беларускай, двор паволі абгараджвауся мурамі, якія надавалі яму значэнне то «twierdzy», «placówki», то «острога»--залежне ад арыентацыі гаспадара -- на забранай зямлі.

На за гэтымі мурамі было «хлопство», «мужыкі»,—для жыхароу з двору—ні было народа.

Народ за ніушанаване яго нацыянальнай годнасьці плаціу непрыязню, якую хавау да часу.

І калі прыйшоу «час», з большэвікамі, і камітэтамі, народ надта ахвотна аддавау ім у рукі сваю долю, маючы на увазі перш за усе чужыя ніродныя яму двары.

Можа каб ен лічыу іх сваімі ні было-б той напраснай крыуды, якую народ дапушчау.

Далей так ні павінно быць. Беларусь уступіла на новы шлях свaей гісторыі—нізалежнай дзержаунасьці, і на гэтым новым шляху абраз павінны быць іншым.

Двор павінен разбурыць акаляючыя яго муры і замест «twierdzy» «астрога» зрабіцца оазаю нацыянальнай матэр'яльнай і духоунай культуры.

У гадаушчыну сьмерці М. А. Богдановіча.

12/v—17 г.=12/v—18 г. ст. ст.)

Лебедзь лунаў высока над небам. Акропляны месячнымі праменнямі, ён дабіваўся да яркіх зорак... Ен дасягаў такой вышыні, дзе скрыдлы ні вытрымліваюць.

І скрыдлы падламаліся...

* * *

Год таму назад ні стало нашаго вялікаго песьняра—Максіма Богдановіча.

Год гэты вельмі памятны у гісторыі адраджэння Беларусі. Усе нашыя перадавыя людзі, захопленыя хваляй новаго лёсу нашай гаротнай Бацькаўшчыны, жыўшы у палітычным віхору, дзе на арэні народаў выступіў і наш беларускі народ,—час ад часу адпачывалі душою, чытаючы у беларускіх часопісах «Вольная Беларусь,» «Гоман,» «Беларуск. Рада) лебядзіныя песьні — пасьмертныя творы М. Богдановіча.

У іх людзі, змарыўшыеся вялікай барацьбой, знаходзілі тую асьвежаючую крыніцу, каторая дадае сілы для далейшай працы.

Апошні акорд арфы паплыў у абшары, але струны іщчэ ні змоўклі, — яны дрыжаць, хвалююць паветро, і пяюць і плачуць і вабюць свaёй цуднай гармоніяй...

— Ці ён памёр?—пытаецца кожны у сэрцы сваім, чытаючы яго творы.—

— Не.... Ен жывець, ен жывець...—пэрэканаепца кожны: Для вялікіх сэрцам і душою ніколі німа сьмерці. Для тых, што скідаюць векавы пылса скарбу душы роднаго абяздоленаго народу і паказываюць перад усімі яго ніпасьрэднюю пекнату,—жыццём мяжы ні паложано.

Арфа натхнёнаго песьняпэўцы мае тую таёмную сілу чар, што раз быўшы у яго руках, ўжо ні моўкне да самаго канца сьвету.

Гэтакай арфай быў адароны мўзамі наш паэт М. Богдановіч.

* * *

Яго песьні тым болей чаруюць, што сьпеваныя іх тварцом на чужыне, далёка ад роднаго краю, яны палаюць бязмежным агнём закахання да Беларусі, каторы пышыць з душы толькі пры разлуцы.

* * *

Яго песьні тым болей чаруюць, што у іх паэт пераліў у гармонію шэпты беларускіх пушч, гоман беларускіх ручаёў, казкі русалак, фарбы жытніх васількоў, трапары нябесных зор, с каторымі ён часта быў злучаны у гутарках аб Бацькаўшчыне.

* * *

Яго песьні тым болей чаруюць, што у іх мы бачым усю пекнату нашаго краю, у іх мы чытаем старыя летапісы чула—мягкай душы нашаго народу. У іх зноў уваскрасаюць нашыя прашчуры, ад якіх мы маема свой асобісты склад душы, лад жыцця, якія аставілі нам свае ўласныя, рожнючыя ад другіх традыцыі.

Сваімі песьнямі М. Богдановіч нам казаў адвечную строгую праўду аб тым, што беларускі народ—ні горшы, ні бяднейшы інтэлектам сваім за усе народы зямлі.

Пасьля вялікіх сваіх парыванняў с чужыні на Бацькаўшчыну, Богдановічу удалося быць у сталіцы быўшаго Беларуска-Літоўскаго Княства -- Вільні у 1911 годзе. І вось словы, сказаныя ім на адным з яго рэфэратаў у Менску у 1916 годзе, ні выходзяюць з маей памяці:

«Я быў пад Вострай Брамай, дзе бываюць дзесяткамі тысячаў паломнікі-богамольцы.- На Браме красуецца гэрб старога Бел. Літ. Княства—«Пагоня»: узброены рыцар сядзіць на скачучым кані і размахівае мечом. Перад маімі вачыма рыцар вырастае у вялікія размеры і меч яго пападае як раз у маё сэрцо... Я ранены і запаланёны навекі...»

Паэт запалонены навекі сымболем «Старой Беларусі» і дзеля гэтаго ён усё жыццё сваё аддае на ўзбудаванне Новай Беларусі... І старое з новым у нашай зямлі злучаецца у яго песьнях у адзін багатамэлёдзійны гімн, каторы зычна разліваецца па усіх шнурах і загонах беларускіх хлебаробаў.

Гэты гімн, як той рыцароў меч, трапляець у сэрцо кожнаго с сыноў Беларускай зямлі, пасьля чаго ніхто ні можа забыць ні свайго краю ні свайго паэта...

Ясакар.

На беларускім шляху.

Беларускае жыцце у Маскве.

(Гл. № 48).

21 красавіка г.г. бежанцы зрабілі тут другі сход на якім было каля 200 чалав. На сходзе, які быў аб'яўлены падгатоўчым, разглядалося бежанскае пытанне і становішчо Беларусі у сучасны момэнт. Паведаміцелямі па стане бэжанскай справы у Пецярбургу і Маскве выступалі Канчэр (Пецербург) і Дыло (Масква). Пастаноўлено выдзяліць часовае бюро для помачы бежанскаму аддзелу Б. Н. К. і склікаць у бліжайшым часе новы сход. А сучасным становішчу Беларусі паведамленнё рабіў Канчэр.

«Беларуская Народная Грамада» у Маскве саўсім зацікла. Аб тым каб яна рабіла сходы і вела якую небудзь палітычную працу нічога ні чуваць. Гэта тлумачыцца хіба тым, што грамада злучала людзей усякіх палітычных напрамкаў, але такіх што на згоду да «савецкай» ўлады ні пойдуць. Асобныя сябры яе аднак ні пакідаюць працы на культурным і грамадзкім пляцу.

Арганізацыя Соцыялістычнай Грамады, пасілілася новымі членамі эвакуіраванымі с Петраграду і прыехаўшымі з другіх мейсцоў. У тутэйшай арганізацыі паднялося пытанне аб стварэнні новаго цэнтру заместа Ц. К. каторы аддзеляны цяпер ліняй нямецкай окупацыі. Сябры грамады пастанавілі падтрымоўваць бежанцоў; дзя безплатнай працы у бежанскай справе запісалося 72 чалавекі.

14 красавіка у Маскве адбыўся арганізацыйны сход «Беларускаго Юрыдычнаго Обчаства». «Обчэство» мае злучаць у сябе ні толькі беларусаў с пахаджэння, але і тых людзей другіх народнасьцяў, якія радзіўшыся на Беларусі, ці служыўшы тамака доўгі час, хацелі-б працаваць на карысць краю. «Обчэство» будзе развaжаць тэорытычныя і практычныя пытання публічнаго і крыміналічнаго права, якія насоўваіімуцца палітычным жыццем.

Паведаміцелям сходу ад ініцыатыўнай групы быу грамадзянін А. Н. Іодкоўскі. Ен сказаў, што «Обчэство» ха-

цело-б быць карысным для бежанцаў сваёй юрыдычнай консультацыяй, а так сама і для Нацыянальнага Камісарыяту. Быў разгледжаны праэкт статуту. Другі сход меўся быць 21 красавіка.

Газэта «Дзянніца»—вестка Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту—на першы пагляд робіць прыкрае ўражэнне. Двама «брацкімі» мовамі пералічаюцца у ёй грахі беларускай «буржуазеі» і соцыялістаў—«згоднікаў», востра крытыкуеццачыннасць беларускаго Ураду—Рады і Сэкрэтарыяту, выхваляецца «савецкі» кшталт дзяржавы. Але прыглядзеўшыся бліжэй,—бачым што гэта толькі «казенны штыл», а за ім хаваецца праўдзівая любоў да бацькаўшчыны бажанне бачыць Беларусь усю, ніразарванай і цэльнай, і шчаслівай.

Іначэй быць ні можа. Падзівіцеся: і беларуская Масква саўсім ні ведае «саботажнікаў».

N.

Сход уцекачоў-Беларусаў у Петраградзе.

14 красавіка у цырку «Модэрн» адбыўся сход уцекачоў-беларусаў і грамадзян беларусаў замешкалых у Пецярбургу. Зышлося усяго каля 8000 чалавек. Першым разглядалося пытанне аб сучасным становішчу Беларусі. Паведамляў Канчэр. У часе дэбатаў над гэтым пытаннем адзін с прамоўцаў сказаў, што каталікі ні ёсьць беларусы, а па крыві і духу палякі. Увесь цырк захваляваўся ад абурэння сходу. Пачуліся пратэсты як ад каталікаў, так і ад праваслаўных: «гэта даўнейшая рэлігійная траўля, далоу, далоу!» Словы Канчэра, сказаўшаго: «на Вольнай Беларусі ні павінно быць і ні будзе нацыянальнай і рэлігійнай траўлі» сход прыняў гарачымі воплясками.

Паведаміцелямі аб другім пытанні—бежанскім—былі Сабалеўскі і Крахельскі. У скутку—зложана камісія да бежанскіх справаў у складзе: Чэрэпук (Гродз. губ.), Сілюк (Віл. губ.), Шаматун (Сувалск. губ.), Жарановіч (Магіл. губ.), Корсак (Віцебск. губ.), Сабалеўскі і Канчэр (Менск. губ.).

Нароўская арганізацыя Бел. С.-Д. Р. партыі злучылася з бальшэвікамі і ўступіла у іх агульную арганізацыю пад назовам «сэкцыя беларусаў». У культурна-прасьветнай справе сэкцыя мае поўную аўтаномію. Пры ёй закладаецца аддзел «Ахвотнікаў Беларускаго Народнаго Штукарства».

Агульныя весткі.

КІЕЎ 21/V. Украінскае міністэрство приступіло да апрацоўкі аграрнай рэформы. Скліканы на параду вучоныя сілы і знатакі гаспадарскіх справ.

(«Yoss. Zeit.» № 255).

КІЕЎ 21/V. На украінскім таргова-прамысловым зьездзі старшыня кіеўскаго жалезнадарожнаго району абрысаваў становішчо жалезн. д. Ен зьвярнуў увагу на вялікі лік лішняго пэрсоналу—на Донецкіх залезніцах лішні пэрсонал даходзіць—2384 чал. с пэнсіяй 650000 руб., на поўднёва-заходніх—16000 чал. с пэнсіяй —46000000 р. Наогул трáціцца на украінскіх жалезьніцах на лішні пэрсанал — 200000000 руб. У 1917 г. 16221 вёрст украінскіх жалезьніц далі убытку 800000000 рублёў. Такая была гаспадарка.

(Kreuz—Zeit, № 253)

БАТУМ 19/V. Замешацельство на Каўказе разрастаецца. Горад Петроўск на Каспійскім мору заняты большэвікамі ад мора. У паўночным Каўказі растуць ніпаразуменні і стычкі між каўказцамі і горцамі.

(Kreus-Zeis № 253)

ПЕЦЯРБУРГ 20/V. Форт Іно заняты фінамі на дарозе з Выбарга у Пецярбург быў узорван чырвонагвардзейцамі пры адходзе.

(«Yoss. Zeit.» № 253).

ЛОНДАН. Апошні налёт нямецкіх лятуноў на Лондан учыніў гораду шмат шкоды. Забіта—27 чалавек, ранено—163.

(Kreus Zeit. № 254)

ПЕЦЯРБУРГ 20/V. Па апошнім весткам быўшы цар Мікалай знаходзіцца ішчэ у Табольску. За ім пасланы аддзел латышскіх стрэлкоў, дзеля пераведзення у Маскву.

Kreuz. Zeitung. № 254).

АМСТЭРДАМ 21/V. Ангельскі урад прадаўжае арэштоўваць у Ірляндзіі відных палітычных дзеячоў. Найбольш церпяць самосційнікі (sinfein). Іх старшыня Плэнкэж і 72 другіх арэштованы і увезены у Англію.

(Kreus Zeit. № 254).

АМСТЭРДАМ 21/V. Лік арэштаваных павялічыўся Сінфейнароў-самастійнікоў арэштовано да 174.

«Германія» № 232).

КОПЭНГАГА 21/V. У Ісляндзіі разрастаецца рух за яе аддзеленне ад Даніі. Рух гэты падтрымоўваецца Англіяй.

(«Yoss. Zeit.» № 255).

Беларусу.

Калі спытаюць у цябе,
Якой ты з малку веры
І хто ты будзеш, як усе
Адчыняць працы дзьверы:
Дык адказаць павінен ты,
—«Я беларус с прадвеку!
«І буду ім ва ўсякі час,
«Бо сілы есьць цяпер у нас...
«А Бог адзін у сьвеці».

М. Запельскі.

24 Мая 1918 р.
Менск.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 24 мая 1918 року.

З А Х А Д: Палажэнне без перамены.

У ваколіцы Кэммэля па абодвых баках р. Ліс і Скарпы, паўднёвей Соммы і між Морэйль і Мондідье артылерыйская чыннасьць ажыўлялася пад вечар і была рухаваю ў ночы. Чыннасьць пяхоты абмежоўвалася разьведачным бітвамі. Мейсцовыя прэдпрыемствы паўднева-захадней Бюкуа і на Уазі, прынесьлі нам палонных.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Беларусы жалезьнічнікі, якія павыежджалі шукаць шчасьця у Маскву, спадзяючыся на помач жалезьнічнікау—таварышау з Расіі, нацярпеліся тут ні мала клопату. Вельмі балюча захапіла іх пастанова «Вікжедора» аб невыплаце пэнсыяу тым з служачых якія ні схацелі эвакуіравацца і засталіся у мейсцох занятых нямецкім войскам. Толькі пасьля таго, як удалося пераканаць Глауны Дарожны Камітэт Александраускай жалезьніцы, што служачыя ні выехалі дзякуючы адозвам Камісарау „западной области и фронта", каторыя увесь час заклікалі сядзець на мейсцу і ні «поддаваться на провокацію», жалезьнічнікі атрымалі абецанку, што ім будзя выплачана пэнсія за два месяцы і яны будуць прыняты на службу. Цяпер іх часткай назначаюць на лінію Александраускай жалезьніцы, а часткай пакідаюць у Маскве.

Мясо мясьнікам і шпіталям 5-ай часьці места выдано скотабойняй учора, 24 мая: мясьнікам 3-яй часьці места сягоння, 25 мая.

Дзеля рэгістрацыі жыхароу 3-ай, 4-ай і 5-ай часьцей места, у найбліжэйшых да сябе мясных крамах былі назначаны тры дні—22, 23 і 24 мая, але срок прадоужэны.

Пачаушы даставаць мяса с сягоняшняго дня г. з. с 25 да 28-го мая, пакупацелі уплачываюць і грошы у мамэнт выдачы мяса, а не пры выбарцы картак.

Афіцэрскім бюро учора, 24 мая, выдана пэнсія за май па № 500;

Сягоння, 25 мая, с № 500 па 700;

Заутра, 26 мая с № 701 па 950.

Рэгістрацыя афіцэрау, дохтароу і ваенных чыноунікау, на аснові апошняго прыказу нямецкіх уласьцей, павінна быць закончэна да 1 го чэрвеня.

Сягоння, 25 мая, павінны явіцца дзержацелі старых карт па 1-ай рэгістрацыі па № 300

Заутра—па № 600.

Ніявіушымся да 1-го чэрвеня прэкрачаецца выдача пэнсіі.

Ка уладжэнне губэрнскаго земскаго кніжнаго складу сабраннем гласных адпушчэно с сумм губ. земск. збору, пасьля вялікіх спрэчак—250,000 р.

Усяго ад 9-ці паветау і ад места Менску, як асобнай земскай адзінкі, на бягучы год земскаго збору па разверстцэ, пацьверджано губ. зем. сабраннем належачыя 3,871,301 р. 31 к.

Расходная сьмета губ. земства на 1918 г. зафіксіравана сабраннем гласных у каласальной сумме—3,990,231 р. 28 к.

Найболей вялікія цыфры упісаны у артыкуле па садзержанню земуправы (119,570 р.), на павялічэнне акладау служачым, на новабарысаускую зембагадзельню — (162,189 р. 40 к.), на садзержанне харчоваго аддзелу управы (142,765 р.) і—для патрэбы вышэйшай, сярэдняй і ніжэйшай школ, што ужо намі пераліченo.

На балотную станцыю—(29,239 р.), на культуро-гідро-тэхнічнае бюро—(7,000 р.), на вопытнае балотнае поле—(9,000 р.), на мэтэорологічнае бюро—(6,500 р.), на сываротку процiу эпідэмій жывелы—(5,000 р.), на майстэрню, прынятую ад хаурусу інжэнерау—(5,000 р.), выпускаючую плугі для хлеборобау.

На выдавецтво афіцыоза «Наше Земское Дѣло» губ. земск. сабранем пацьверджан расход у сумме—37,250 руб.

На сталоуку пры ст. Менск Л.-Р. ж. д. за кепскія харчы была падана жалаба группай жалезьнякоу у харчово-коапэратыунае бюро пры упрауленні.

Па затрэбаванні тлумачэння ад адміністрацыі сталоукі, апошняя с паперай у руках сабірала «подпісі ад асоб» «давольных" сталом.

Шмат хто ні давау сваей подпісі.

Рэзультат жальбы—гэтымі днямі.

Арэшт, штраф да 20.000 марак, ісправіцельны дом і сьмертная кара налагаюцца ад 6 мая глаунакаманд. X арміі генэр. фон-Фанкельгаймом на жыхароу новаакупованых мейсц за: прэднамеранае і умысьнае убіуство, грабеж, вымагательство, гвалтованне, кражу, утайку, падлог і псаванне мення, калі праз гэтыя праступкі парушыцца грамадзянскі парадак і спакойствіе і калі гэта тычыцца ваенных інтэрэсау.

Губ. акцызным упрауленнем у постаці упрауляючага акцызнымі зборамі Дзіаніна, узбужано хадатайство перад нямецкім граданачальством аб увелічэнні акладау пэнсіі сваім служачым да нормы, атрымаючых чыноунікамі скарбовай палаты і казначэйства.

На хадатайство губэрнскаго прысуцтвія аб выдачы заштатных грошоу служачым б. выкупна-сэрвітутнаго аддзелу нямецкімі уласьцямі адказано, што гэта—справа мінуушчыны, і дзеля гэтаго належыць да Рады Народных Камісарау.

У пасядзэнні местовай думы ад 23 мая, побач з другім, рэшано рэорганізаваць грунтоуна гаспадарскі аддзел, с одпускам на адчыненне пры ім склепу 100,000 р.

Меська харчовая камісія паведамляе, што ніатрымаушыя с сваіх хлебных крам хлеба, могуць атрымаць яго з меськіх крам:

а) Петропаулоуская, процiу акружнога суда і б) рог Захароускай і Серпухоускай, д. Федаровіча

Сягоня у гадаушчыну смерці беларускаго паэта і пісьменніка Максіма Богдановіча у Беларускім Народным Доме яго імяні (Дольная Ляхоуска д. № 7) адбудзецца Літэратурны вечар. Лекцыю прачытае Косьцевіч. Артысты Беларускаго тэатру будуць дэклямаваць вершы с тво[р]ау М. Богдановіча.

Курсы беларусазнаўства.

25 мая лекцыя Я. Лесіка «Гісторыя Вялікаго Князьства Беларуска-Літоускаго».

Пачатак а 7-ай гадзіне.

Весткі с краю.

м. Радашковічы, віленскай г. вілейскаго пав.

(ад нашаго кар-та).

Вучыцялі тутэйшай пачатковай выжэйшай школы арганізуюць курсы для падгатоўкі вучняў і вучаніц у I, II, III, IV, V і VI клясы вучылішч або гімназіі. Плата мае быць 30 рубл. за курс.

Справа вельмі добрая і важная; шкада толькі, што шмат хто са стараны ні можа пасылаць сваіх дзяцей туды, бо цяпер і с харчамі цяжка, пры даражыні работніка свайго дзіця служыць вялікай падмогай у гаспадарцы.

* * *

19-го мая тут адбылася беларуская вечарынка с тэатрам. Арганізуе яе выжэйшая пачатковая школа. Ігралі: «Рэвізыі» і «Міхалку»; пасьля былі уладжэны дэклямацыя і розныя гульні.

Толькі вітаць і цаніць трэба з руплівасьці тутэйшых вучняў. Будзім спадзевацца, што с часам тут зарганізуецца сталая дружына ні толькі тэатральная, але сьпевацкая і мо' нават музычная.

Д.

м. Смолевічы. Як нам паведамляюць у сераду 22 мая, поўдзен быў у мястэчку вялікі пажар. Гэтаму запамог і вялікі вецер. Зусім мала хат асталося. Жыхары асталіся пад адкрытым небам. Страты вялікія.

У мястэчку жыло шмат уцекачоў з Віленшчыны, Гродзеншчыны і Ковеншчыны.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.